Источник: "Настаўніцкая газета" - 2015-04-02

**26 сакавіка адзначыў свой 75-ы год нараджэння вядомы беларускі гісторык, доктар гістарычных навук, акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, прафесар Міхаіл Паўлавіч Касцюк. Нарадзіўся ён у працавітай сялянскай сям'і ў вёсцы Масцішча Навагрудскага раёна Гродзенскай вобласці. Менавіта ў гэтай вёсачцы будучы акадэмік атрымліваў пачатковую адукацыю.**

# Выдатны вучоны і настаўнік



Потым была вучоба ў Рэцямлянскай сямігодцы. Міхась Паўлавіч з асаблівай цеплынёй расказвае пра выкладчыка фізікі гэтай сямігодкі Пятра Арцёмавіча Андрэева. Паводле слоў Міхася Паўлавіча, гэта быў надзвычай строгі настаўнік, які пры гэтым у душы быў лірыкам і, пражыўшы доўгае жыццё, выпусціў некалькі зборнікаў вершаў.

Пасля сямігодкі станаўленне асобы будучага акадэміка адбывалася ў Навагрудскім педагагічным вучылішчы, дзе на той час працаваў выдатны калектыў настаўнікаў. Так, беларускую літаратуру выкладаў паплечнік Якуба Коласа па стварэнні ў пачатку XX ст. падпольных беларускіх школак Мікалай Міхайлавіч Жук. Ён не толькі цудоўна ведаў свой прадмет, але і быў надзвычай акуратным — прыходзіў на заняткі заўсёды стыльна апранутым, у глянцавых ботах. Сярод выкладчыкаў вылучаліся таксама сваім высокім прафесіяналізмам класны кіраўнік выкладчыца біялогіі Тацццяна Іванаўна Кукаловіч, выкладчык малявання і чарчэння Пётр Сцяпанавіч Башко, музыкі — Іван Васільевіч Фандыбок.

Пасля заканчэння вучылішча М.П.Касцюк быў размеркаваны на працу ў вёску Кемяне Шчучынскага раёна. Яшчэ да пачатку заняткаў у школе ён на спадарожнай машыне паехаў у Гродзенскі педагагічны інстытут і здаў паспяхова ўступныя экзамены на гісторыка-філалагічны факультэт Гродзенскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя Янкі Купалы. Больш за паўстагоддзя мінула з часу навучання ў інстытуце, але і цяпер Міхась Паўлавіч з вялікай удзячнасцю расказвае пра сваіх педагогаў: выкладчыкаў беларускай літаратуры Аляксея Міхайлавіча Пяткевіча і рускай літаратуры Васіля Іванавіча Казлова, гісторыі Віктара Аляксеевіча Ваяхіна, Якава Навумавіча Мараша, Барыса Маркавіча Фіха, Дзмітрыя Спірыдонавіча Маркоўскага.

Закончыўшы вучобу ў інстытуце, у 1963 годзе ён атрымаў накіраванне ў Навагрудскі раён, дзе працаваў дырэктарам Касадворскай васьмігадовай школы ў вёсцы Баяры Нягневіцкага сельсавета. Тут малады дырэктар Міхась Касцюк атрымаў першы вопыт арганізатарскай і педагагічнай працы. У школе працавала больш за 20 педагогаў і вучылася амаль паўтары сотні вучняў.

Неўзабаве ён робіць першыя крокі на шляху навукова-даследчай дзейнасці і ў снежні 1966 года паступае ў аспірантуру Інстытута гісторыі АН БССР. Пад кіраўніцтвам акадэміка Івана Сяргеевіча Краўчанкі малады даследчык натхнёна займаўся распрацоўкай даволі складанай праблемы — вывучэннем працоўнай актыўнасці калгаснага сялянства Беларусі ў 1933—1940 гг. і ў 1969 годзе паспяхова абараніў кандыдацкую дысертацыю. Выдатныя арганізатарскія здольнасці М.П.Касцюка абумовілі прызначэнне яго на адказную пасаду вучонага сакратара Інстытута гісторыі АН БССР. У 1975—1981 гг. Міхаіл Паўлавіч працаваў на той жа пасадзе, толькі ўжо ў Інстытуце гісторыі партыі пры ЦК КПБ.

У снежні 1979 года М.П.Касцюк паспяхова абараніў доктарскую дысертацыю па тэме "Дзейнасць Кампартыі Беларусі па ідэйна-палітычным выхаванні сялянства ў перыяд будаўніцтва сацыялізму". Навуковым кансультантам пры выкананні гэтага дысертацыйнага даследавання быў акадэмік Іларыён Мяфодзьевіч Ігнаценка.

У ліпені 1981 года Міхаіл Паўлавіч вярнуўся ў Інстытут гісторыі АН БССР, але ўжо на пасаду намесніка дырэктара па навуковай рабоце. З лютага 1988 г. на працягу амаль 12 гадоў Міхаіл Паўлавіч узначальваў вядучую беларускую навуковую гістарычную ўстанову — Інстытут гісторыі. Тут М.П.Касцюк праявіў сябе выдатным арганізатарам і каардынатарам гістарычнай навукі не толькі ў рамках Інстытута гісторыі, але і ў рэспубліцы ў цэлым.

Абсалютна перакананы ў тым, што "без гістарычных ведаў і выкарыстання гістарычнага вопыту нельга паспяхова будаваць незалежную дзяржаву", Міхаіл Паўлавіч удзяляе вялікую ўвагу папулярызацыі гістарычных ведаў, выступаючы на старонках перыядычных выданняў, на радыё і тэлебачанні, на шматлікіх міжнародных і рэспубліканскіх канферэнцыях, семінарах і сімпозіумах.

Важным напрамкам дзейнасці шаноўнага юбіляра з'яўляецца падрыхтоўка навуковых кадраў. Тут ужо можна весці гутарку пра фарміраванне навуковай школы акадэміка Касцюка. Пад яго навуковым кіраўніцтвам былі падрыхтаваны 4 дактары і больш за 20 кандыдатаў навук. Характэрная асаблівасць стылю Міхаіла Паўлавіча як навуковага кіраўніка — давер і ўвага да новых арыгінальных падыходаў пры даследаванні гістарычных працэсаў.

У 1981 годзе Міхаіл Паўлавіч быў узнагароджаны Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета Беларускай ССР. У 1989 годзе ён быў абраны членам-карэспандэнтам, а ў 1996 г. акадэмікам НАН Беларусі. У 1998 г. М.П.Касцюк атрымаў дыплом сапраўднага акадэміка Цэнтральнай еўрапейскай акадэміі навук і мастацтва. Паводле рашэння Міжнароднага навуковага савета Амерыканскага біяграфічнага інстытута, у 1999, 2002, 2005 гадах ён быў прызнаны чалавекам года. У 2009 г. імя М.П.Касцюка было занесена ў Кнігу славы Навагрудскага раёна, а ў 2010 г. ён быў абраны ганаровым грамадзянінам Навагрудка і раёна. У верасні 2010 года Міхась Паўлавіч атрымаў адну з найвышэйшых дзяржаўных узнагарод — медаль Францыска Скарыны.

Плённую навуковую працу М.П.Касцюк паспяхова спалучае з актыўнай грамадскай дзейнасцю. Ён з'яўляецца старшынёй камітэта Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў, намеснікам старшыні Беларускага камітэта міру, сябрам прэзідыума Беларускага фонду культуры.

Незалежна ад таго, на якой пасадзе знаходзіцца Міхаіл Паўлавіч, ён вызначаецца добразычлівасцю, паважлівымі адносінамі да людзей.

**Валянцін МАЗЕЦ,
старшы навуковы супрацоўнік Інстытута гісторыі НАН Беларусі, кандыдат гістарычных навук, дацэнт.**

ISSN 1994-9146